**Валерыя Кустава**

# Кроў Сусвету

Вершы

Мінск
Мастацкая літаратура
1996

ББК 84(4Беи)6 К 94
УДК 882.6-1 + 882.6-32

Прадмова
Васіля Жуковіча

ISBN 985-02-0389-7

© В. Кустава, 1996

**Чыстая душа,**
**або Феномен Валерыі Куставай**

З ёю сустрэўся я на творчай вечарыне Сяргея Новіка-Пеюна, у Доме літаратара, калі ёй пераваліла... за сем гадкоў! Была яна ў прыгожай зялёнай сукенцы і сядзела поруч з мамаю; даволі ўважліва слухала прамоўцаў, музыкаў, спевакоў. Пазней прачытаў у «Бярозцы» (№ 9-10, 1992) яе адметныя вершы з уступам Алеся Разанава.

Валерыя Кустава... Хто яна? Дзяўчынка, якая дзевятага чысла дзесятага месяца 1984 года з'явілася ў Менску на белы свет. Натуральна, ёй даспадобы ласкальная форма свайго імя, але ж не Валерка, не Валерачка, а — Валерушка. Ёсць у гэтым гучанні нешта пышнае, кусцістае, як, дарэчы, і ў самім про- звішчы — Кустава. Натуральна, чымсьці яна, цяперашняя школьніца, надобная на іншых дзяцей. Ды гэтая дзяўчынка незвычайная: яна — творца, да яе прыходзіць, не, хутчэй за ўсё прылятае натхненне. А пачало яно хваляваць яе з самых ранніх гадоў маленства: дзіця, акрыялае пасля цяжкай хваробы, яшчэ не ведаючы нават азбукі, рантам стала дзіўныя сказы казаць. Дзякуй Богу, было гэта заўважана роднымі. Раз-пораз, калі Валерушка прамаўляла, мама ды бабуля занатоўвалі, пісьмова афармлялі вусныя (вымаўленыя вуснамі) творы. Такая завядзёнка скончылася, калі дзяўчынка навучылася пісаць, пачала хадзіць у школу. Словам, ужо даўно занатоўвас сама.

Мяне дзівіла і дагэтуль дзівіць, як дзяўчынка-дзіця можа быць зусім дарослаю ў сваіх пачуццях і думках і як ёй нярэдка ўдаецца дасканала іх выказваць. Хто ці што — Зямля, Неба, Сусвет — дыктуе такія сур'ёзныя словы? І чаму такая духоўная ноша кладзецца на дзіцячую душу? Бо яна чыстая? Мо толькі абсалютна чыстай душы голас можа даходзіць да глыбіняў космасу чалавечай свядомасці? А можа, і да ўсявышняе сілы такая энергія даходзіць хутчэй за іншыя?

Звяртаецца Валерыя Кустава да такіх субстанцый, як Зямля («Я люблю цябе, Зямля мая ад Бога, за тое, што тут нарадзілася і жыву...»), чалавек («Ты — грэш- ны! Перад Небам і Зямлёй! Перад дрэвамі і травой! Перад зверям і вадой! Ты — грэшны!»), Бог («Божа! Зрабі пас вольнымі, як птушак...»). Творы яе часам нагадваюць малітвы, прыпавесці, іншы раз — патаем- ныя, як бы з іншага жыцця ці жыцця падсвядомага, згадкі, снабачанні.

*Белае поле,*
*А над ім — белы голуб...*
*Ідзс па полі белы чалавек,*
*А за ім слядоў няма.*

Так пачынаецца адзін верш. Інтрыгуе белае поле, белы голуб, а найбольш — белы чалавек, за якім слядоў няма. У вершы яму адрасуецца пытанне. «А ён ідзе, ідзе...» Пытанне паўтараецца; пытанне канкрэтнае: «— Дык чаго ж за табой слядоў няма?» І тут высвятляецца, што белы чалавек не ўхіляецца ад адказу на пытанне — яму баліць перажытае: «У яго на вачах з'явіліся буйныя слёзы». Адчуваецца перажытая драма. Яна адчуваецца і па засяроджанасці белага чалавека, і па ягоных слязах. Магчыма, на яго рахунку і нейкі грэх. На пытанне ён адказвае ўскосна: «— Вунь, бачыш, нада мной белы голуб ляціць і ні на крок не адстае,— гэта ўспамін майго кахання». Нават паставіўшы апошнюю кропку ў вершы, паэтка не адпускае ўвагу чытача, запрашае яго паразважаць.

Уражваюць сваей арыгінальнасцю, вобразным развіццём, лагічнай завершанасцю вершы: «Кроў Сусвету», «Мара кахання», «Старая сасна», «Беларусь мая...», «Зімою», «Жыццё наша...». Верш «Жыга, жыта, жытачка...» блізкі да фальклору, ён пра дзяўчыначку-сіраціначку і яе смутак па незабыўнай матулі:

*Пабегла сіраціначка*
*да мамкі на магілачку...*
*— Устань, устань, мамачка, мамачка.*

Узрушвае баладным зместам і радуе мастацкай дасканаласцю пяшчотны верш «Вясной-вясенькай». У ім распавядаецца пра тое, як чалавек са стрэльбаю зруйнаваў галубочкава шчасце і шчасце яго птушынай сям'і.

А было яно такое светлае, чыстае, бясхмарнае:

*Вясной-вясенькай*
*Галубочак закахаўся,*
*Галубочак ажаніўся*
*З галубачкай белай.*

*Нарадзіліся*
*І дзеткі малыя.*
*Галубка рада,*
*Галубок рады.*
*Наляцеў галубок*
*Есці ім прынесці.*

І вось здарылася гора: чалавек забіў галубочка. У адчаі галубка-жонка ў вышыні склала крылы і паляцела ўніз. Аддалі Богу душу і галубяняткі-сіроткі. Звялася цэлая сям'я, а можа, і род.

Пра зло, учыненае чалавекам з сякерай, гаворыцца ў вершы «Вясна». У ім — два вобразы, звязаныя між сабою,— слыхавы: «стук

сякеры» і зрокавы: «На палянцы ляжала бяроза». І — натуральнае галашэнне ранімай душы:

*...не зацвіце яна наступнай вясной,*
*не раскрыюцца яе завушніцы,*
*не распусціць яна больш*
*сваіх зялёных кос.*

Нам, рамантыкам і рэалістам, наватарам і нязменным прыхільнікам градыцыі, даверлівым і прагматычным, можна спрачацца, разважаць, прагназаваць. Але зусім відавочна: адбываецца феномен! З прыемнасцю дадам: развіваецца гарманічная асоба. Валерыя Кустава ў сваёй творчасці выступае супраць чорных сілаў, асуджае зло ва ўсіх яго праявах. І ў жыцці яна добрая, чулая. Неяк пасля дажджу ёй карцела, калі ўбачыла мокрую пчолку, абсушыць насякомаму крыльцы. Аднаго разу яна сказала: «Калі кінуць у рэчку камень, ёй балюча». Уражлівая, любіць глядзець на неба, назіраць за воблакамі, хмарамі, вясёлкаю ці проста ўглядацца ў бяскрайнюю сінюю глыбіню. Вучыцца Валерушка іграць на скрыпцы, адначасна пачынае ствараць і сваю музыку: вядомая царыца ёй спрыяе. Спявае дзяўчынка з бабуляй народмыя песні. А яшчэ яна любіць маляваць. Часта малюе добрых і злых духаў, белага і чорнага галубоў. Дамінуюць у малюнках колеры: белы, чырвоны, чорны, якія сімвалізуюць чысціню, любоў, журбу. А ці не гэта мы знаходзім і ў яе белых паэтычных творах?

Радуе тое, што ў паэткі свая дарога ў краіну Паэзія, не, не дарога, а шлях.

Пажадайма гарманічнай з'яве набыць крылы, разгарнуцца ў прасторы і часе на ўсю моц.

Вядома, пажадання мала. Валерыя Кустава — феномен, які трэба ахоўваць і акрыляць. Дзеля Бацькаўшчыны, яе духоўнасці, чысціні.

*ВАСІЛЬ ЖУКОВІЧ*

## ***Паслухай, чалавеча...***

* * *

Калі вы, мужчыны,
крыўдзіце жанчын,
то павінна быць сорамна вам,
там у што жанчына —
самая пяшчотная
істота пасля дзяцей,
таму што жанчына —
слабая істота
і сябе абараніць не можа.

А вы ідзяце пасля дзяцей
і пасля жанчын.

*Студзень, 1992*

* * *

Белае поле,
а над ім – белы галуб...
Ідзе па полі белы чалавек,
а за ім сьлядоў няма.
Я клічу яго:
– Паслухай, чалавеча,
што ж ты такое зрабіў,
што за табою сьлядоў няма?
А ён ідзе, ідзе,
а ў канцы азіраецца,
ідзе да мяне
і пытае:
– Чаго табе, сапраўдны чалавеча?
Я кажу:
– Дык чаго ж за табой сьлядоў няма?
У яго на вачах
зьявіліся буйныя сьлёзы.
І адказаў мне ён:
– Вунь бачыш, нада мной
белы галуб ляціць
і ні на крок не адстае –
гэта
ўспамін
майго каханьня.

*1993*

* * *

Вясна...
Іду па лесе,
дыхаю празрыстым паветрам.
Раптам — стук сякеры.
Бягу туды...
На палянцы ляжыць бяроза...
Слязіцца па белай кары
халодны сок...
Не зацвіце яна наступнай вясной,
не раскрыюцца яе завушніцы,
не распусціць яна больш
сваіх зялёных кос...
Гэта твой грэх,
чалавек.

*17 студзеня 1994*

* * *

Беларусь мая
ў засьнежанай прыгажосьці.
Палі твае белыя
чыстым крышталем блішчаць.
Ды не чуваць вясёлай песьні
жаўрука,
толькі цьвіньканьне сініц...
Яны малыя,
ім халодна тут, –
але ўсё ж нікуды не адлятаюць:
вельмі адданыя сваёй радзіме
гэтыя малыя птушачкі...

*25 лютага 1994*

* * *

Веснавыя песні добрыя.
Людзі, якія пяюць іх,— вясёлыя.

Жыта, жыта, жытачка...
Нарадзілася на свет божы дзяўчыначка.
Будзе яна сірацінчка...
Маці яе добрая памерла,
памерла.
Бацька яе нялюбы мачыху прывеў,
мачыху.
Мачыха — не мамачка,
не мамачка.
Мачыха — цётка злая,
злая.
Пабегла сірацінка да мамкі
на магілачку...
— Устань, устань, мамачка,
мамачка.
Пойдзем мы дадому,
дадому.
11 красавіка 1994

## МАРА КАХАНЬНЯ

Я магутны арол.
Я кахаю цябе.
Маё сэрца ў крыві,
калі бачу цябе ля другога.
Ты не бачыш мяне.
Мяне ценем ты лічыш...
Мо дарма ў сваіх марах
я веру,
што ідзем пад руку да царквы мы...
І дакранаюцца твае вусны да маіх...
І твае блакіты побач з маімі...
Гаворыш ты мне:
«Каханы мой...»
Але гэта
толькі
мара.

*1994*

* * *

Вясной-вясенькай
Галубочак закахаўся,
Галубочак ажаніўся
З галубачкай белай.
Нарадзіліся
І дзеткі малыя.
Галубка рада,
Галубок рады.
Паляцеў галубок
Есці ім прынесці.
Ляціць галубок,
Ідзе чалавек,
Чалавек са стрэльбаю
Ідзе па свету.
Захацелася маладых
Галубак пастраляць,
Маладых галубкоў
Забіваць.
Забіў галубочка,
Забіў галубочка.
Жонка плача,
Дзеткі плачуць,
Есці просяць:
Есці бацька не нясе.
Паляцела галубка,
Паляцела ўвышыню,
Да неба блакітнага.
Крылы склала й
Паляцела ўніз...
Вой, галубка, паляці
Да дзетак сваіх,
Накармі ды напаі
Маленькіх сваіх,
Галубянятак сваіх.
Паляцела галубачка
Дый разбілася.
Дзеткі плачуць,
Есці просяць,
Завуць тату й маці.

Няма бацькі,
Няма маці.
Паляцелі й галубочкі
У неба высокае…
Няма бацькі,
Няма маці,
Сіротак няма…
Няма бацькі,
Няма маці —
Знікла ўся сям'я.

*13 лютага 1995*

## КРОЎ СУСЬВЕТУ

Бачу белае поле –
усё ў чорнай крыві.
Бачу белае поле –
у чырвонай крыві.
Бачу белае поле –
і няма там крыві.
На першым полі
памёр Сатана –
хай ня ўстане ніколі,
каменем у сэрца сваё
забярэ ўсе грахі.
На другім полі
памёр Беларус –
можа, устане калісьці
Беларус і Радзіма –
ён прамовіць адзіна
і для нас, і пра нас.
На трэйцім полі
памёр Гасподзь.
І ўваскрос Ён.
І прыйдзе да нас.

*13 лютага 1995*

## САД СУСЬВЕТУ – САЛОДКАЯ І ВЕЛЬМІ ГОРКАЯ СПАКУСА

*Хвіліну жыцьця свайго*
*бясцэннага аддаў бы таму,*
*хто б сказаў мне,*
*як спыніць грэх.*

Для чаго мы жывем?
Гэта пытаньня
жыцьця і сьмерці.
Наўрад я адкажу на яго,
калі прайду шмат
раяў і пеклаў
і не раз убачу Бога
і д’ябла.
Можа, мы жывем дзеля таго,
каб з кожнага жыцьця браць
грэх
і адпраўляць яго
ў нябыт?
І, нарэшце,
калі мы вычарпаем
усе грахі,
мы паляцім...
Гэта і будзе
сапраўднае жыцьцё.

*17 лютага 1995*

## ПРОБЛІСК

Чорная цемра.
Цёмныя цені.
Чорныя вочы.
Цёмныя ночы.
І на цёмнай вуліцы
У чорным сне
Бачу я пробліск —
Гэта
Дзіцця.

*1 лютага 1995*

## ***Паралелі***

* * *

Малюнкі,
старыя афішы
сыходзяць у нябыт
назаўсбды.
А нашы мары,
нашы думкі
застаюцца тут
на ўсе стагоддзі.

*26 снежня 1993*

## ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

О, суклон —
Гэта лінія жыцця,
Бачу
Чырвоную лінію —
гэта лінія кахання.
Бачу
Жоўтую лінію —
гэта лінія радасці і смутку.
Бачу
Блакітную лінію —
гэта лінія лёсу,
А чорная лінія —
гэта мой грэх.

*9 лютага 1994*

## ЗІМОЮ

Белы снег зімой. Ідзеш,
і ўсё срэбна-белае.
Кусцік белы, дрэва белае,
зямля срэбна-белая.
Усё зімою белае.

І душа чалавека
зімой крыху бялее,
таму што ўсё наўкол
такое прыгожае і добрае.

Добра было б,
калі б у чалавека з
аўседы
была душа белая
і шчырая да іншых людзей.

І неабавязкова,
каб заўсёды
была зіма.

*24 лютага 1994*

**ПАРАЛЕЛІ**

Бог —
    д'ябал.
Неба —
    зямля.
Дзень —
    ноч.
Сонца —
    месяц.
Жыцце —
    смерць.
Радасць —
    бяда.
Дабро —
    зло.
Каханне —
    здрада.
Гэта паралелі
Космасу
    і сусвету.

*10 чэрвеня 1994*

* * *

Самыя цудоўныя словы на свеце —
Мама, Жыццё, Каханне, Бог.
Ад гэтых слоў дзіцяці
на душы адразу цёпла стане.

Самыя жорсткія словы на свеце —
Здрада, Нянавісць, Д'ябал, Смерць.
Ад гэтых слоў
не хочацца жыць.
Ніколі не хачу я
чуць іх...

*20 ліпеня 1994*

* * *

Цемра чорная,
Цемра крывавая,
Цемра грэшная —
Гэта турма.

Маці любая,
Бацька родны,
Дзяўчына каханая
Гэта Радзіма.

*13 лютага 1995*

# ***<u>Зярнятка</u>***

**ДАНЧЫКУ**

З тваіх вуснаў чуем дзіва —
ты аб праўдзе нам песняй гаворыш.

*25 сакавіка 1993*

**ЗЯРНЯТКА**

Адно пасееш —
колас будзе.
Я го пасееш —
поле будзе.

*1994*

* * *

Неба.
На ім блакітныя
І белыя аблокі.
Ёсць і чорныя,
Як хмары
Чарнобыля.

*15 лістапада 1994*

* * *

Мае гады расчараванняў
Пайшлі кудысьці ў нябыт.
А зараз — шчасце і каханне
У маім доме,
У маёй сям'і.

*6 снежня 1994*

* * *

На свеце ёсць багацце –
За грошы не купіць:
І гэта радасць, шчасце –
Хачу каханай быць.

*22 лютага 1995*

## ***Зорачка***

ЧАРНОБЫЛЬ

З маленства я сэрцам імкнуся
Да рэк і азёр Беларусі.
Хоць крыху хацелася б палятаць
Над нівамі Беларусі...
Як церпяць нівы і азёры
Гэты жах!
Як церпяць людзі і жывёлы
Гэты жах!
Як церпяць птушкі
Гэты жах!
Гэты жах бясконцы
У роднай краіне...
Наша краіна
Хоча
Волі!
18 снежня 1992

* * *

Стаіць бярозка белая
Каля майго вакна.
Ёй холадна і жудасна:
Маленькая яна.
Вакол яе мяцеліца
Свой карагод вядзе
І завірухай белаю
Сняжынак круг ідзе.
А з неба кроплі белыя
Ляцяць кудысьці ўніз,
Спяшаюцца, нясмелыя,
Ў зімовай цішыні.

*6 студзеня 1993*

* * *

Мой стары Менск
      чырвона-белы,
Я рада ўсім тваім дарам.
Ты даў жыццё
      ў паветры сінім,
І хлеб з вадою даў ты нам.
Як зоркі,
Бліснулі вачыма
      твае азёры ў цішыні,
Калі на нас
Чарнобыль чорны
Зваліўся з чорнай
Вышыні.

*30 лістапада 1993*

## ЗОРАЧКА

Свячу я на небе,
Палаю вагнём
І срэбныя промні
Кідаю вам сном.
А днём я сціхаю,
Іду адпачыць,
Каб ноччу ізноў
Вам свяціць і свяціць.

*2 снежня 1993*

## ГЛЕДЗЯЧЫ НА ГРАВЮРУ МІКОЛЫ КУПАВЫ «МЕНСК»

Мой стары Менск,
Як ты мне родны!
Я рады,
Што хадзіў
Па тваіх завулках.
Аднойчы, калі я
Першы раз увайшоў у цябе,
Я сказаў Матулі:
— Гэта шчасце,
Што мы
Нарадзіліся тут.

*12 снежня 1993*

* * *

Гляджу я на неба,
На шлях залаты,
Іду я па ім.
І бачу я Бога.
— Скажы ты мне, Божа,
Чаму на зямлі
Усё так чорна і грэшна?
І ён адказаў мне:
— Таму што, дзіцятка,
Сэрца зямлі
Чорнае і грэшнае.
Сядзіць у ім
Д'ябал.

*2 снежня 1993*

* *

Жыццё наша
акіянам бушуе.
Разбіваюцца
хвалі аб бераг —
гэта б'юцца
сэрцы нашы.
Дрэвы каля берага
шумяць —
гэта каханне
наша.
Скалы за дрэвамі
стаяць.
Нерухомыя.
Мёртвыя.
І многа іх.
Гэта —
грахі нашы.

*24 лютага 1994*

* * *

Хто ён,
Гэты добры дух?
Што гэта за бажаство
Зямлі і ўсёй прыроды?
Хто ен,
Магутны над усёй
Зямлёй і сусветам,
Заступнік усяго жывога,
Гэта наш магутны
Божа.

*24 лютага 1994*

## ВЯСНА

Прыйшла вясна сінявокая.
Растаў лёд на рэчках,
Малыя ручайкі пацяклі.
Заспявалі птушкі, зацвілі сады.
І ўсе цвіце.
Вясна ідзе.
На палях сеюць хлеб.
Птушыныя спевы наўкол.
Птушкі ўюць гнёзды.
Вясна ідзе!
Вясна.

*24 лютага 1994*

* * *

Ноч ідзе.
Ліхтары запаліліся.
Чорнае неба,
белыя зоркі на ім.
Удалечыні —
туманы празрыстыя...

Толькі месячык на небе не спіць
і вельмі ярка ззяе,
быццам гаворыць:
«Спі, дзіцятка,
спі».

*13 сакавіка 1994*

**МРОЯ**

Зорачка ты мая,
Добрыя мары ты шлеш мне.
Я сяджу ля кастра, ля дымка,
Цёплы вецер развівае валасы маёй любай...
І зыходзяцца нашы вусны...

Адкрываю я вочы:
Ні кастра, ні дымка, ні любай...
Зорачка,
Навошта
Добрыя мары ты шлеш мне?
Калі гэтага ніколі не будзе.

*20 ліпеня 1994*

## АЖЫЎЛЕННЕ

Няма ўжо лядка
На рэчках і стаўках,
І весела цячэ
Празрыстая рака.
У вёскі і лясы
Жаўраначкі ляцяць.
Ад веснавой красы
Дзяцей не адарваць.

*21 ліпеня 1994*

* * *

Мы ўсе —
адзіная
Божая сям'я.
І ўсё ж я не разумею:
чаму
адзін забівае,
другі смяецца,
трэці кахае,
чацверты злуецца,
а пяты
ляжыць мертвы...
Чаму гэта так?
Калі мы ўсе —
адзіная
Божая сям'я?

*2 лістапада 1994*

## ЖАХ

Што гэта — жах?
Невядома?
Для малога дзіцяці — гэта
Калі няма мамы, таты дома.
Для старых —
Калі смерць надыходзіць,
Для ракі —
Калі яна высыхае,
Для жывёлы, для рыбы, для птушкі –
Калі іх чалавек забівае,
Для дрэва —
Калі яго ссякаюць,
Для мяне —
Калі хтосьці памірае...

*2 лістапада 1994*

**ПОТЫМ**

Зямля,
Я пакідаю цябе,
Я пакідаю сваіх родных і блізкіх...
Але я абавязкова вярнуся да цябе.
Можа, я вярнуся дрэвам,
Можа, я вярнуся птушкай,
Можа, я вярнуся рэчкай,
А можа, чалавекам...
Але вярнуся.

*2 лістапада 1994*

* * *

Мой стары сябра
І заўсбды малады,
Ты вельмі магутны.
Захочаш —
Загубіш душу маю ты,
Захочаш —
Пакінеш у спакоі,
Захочаш —
Возьмеш у свой рай.

*Студзень, 1994*

**ДЗЯДЫ**

Дзяды — гэта памяць
Пра бабуль і дзядуль.
Памяць усёй зямлі.
Мы памінаем сваіх продкаў.
У гэты дзснь яны прыходзяць да нас,
П'юць і ядуць разам з намі,
Запальваюць свае свсчкі-сакрэткі.
Яны любяць нас
І прыходзяць да нас...
Ёсць такі дзень —
Дзяды.

*1994*

* * *

Ідзе старажытны мой гадзіннік...
І толькі гукі скрыпкі
Заглушаюць стук дзвярмі...
Я сяджу ў сваей каморцы,
На старым сваім гарышчы,
І скрыпка мая залатая
Боскі той гук выдае…
І гэтыя струны,
І гэтая скрыпка
Маё суцяшэнне адно.

*1994*

**ПАТАЕМНАЕ**

Ішоў вялікі лівень.
Дрэвы сталі мокрыя.
Празрыстым дажджавым царствам
паказалася гэта мне…
Я заснула.
А раніцай убачыла,
што гэта проста шыба.

*Сакавік, 1994*

## СТАРАЯ САСНА

Цвіла яна калісьці зялененькай іглiцаю.
І птушкі прыляталі да яе спяваць.
Хутка прайшлі год, два... сто пяцьдзесят гадоў.
Колькі ж яна бачыла! Значна болей, чым я.
Але яна не можа гэта ўсе нам расказачь —
сосны не гавораць...
Адно суцяшае сасну —
душа яе ніколі не памрэ.

*Сакавік, 1994*

## ХАЧУ Я НА ВОЛЮ

Сяджу ў турме я.
Не бачу ні поля,
Ні жытняга хлеба,
Ні кроплі вады.
Не бачу ні лесу,
Ні сонца прадвесня,
Ні белай Радзімы,
Ні роднай зямлі.
Хачу я на волю,
Катацца на конях,
Хачу я ў пушчу,
На родну зямлю.
Хачу гаварыць я
На роднай мне мове
І пець пра Радзіму,
Пра маці сваю.

*2 лютага 1995*

## ***Там, у вышыні***
(ВЕРШЫ РОЗНЫХ ГАДОЎ)

* * *

Так хочацца
у мінулае і ў будучае,
У мінулым мне было
так весела і радасна.
У будучым
мне купяць сабаку.

## ЗЯМЛЯ

Я люблю цябе,
Зямля мая ад Бога,
за тое, што тут нарадзілася
і жыву,
дзе горы і мора,
дзе дрэвы...
і птушкі пяюць,
плаваюць рыбкі ў вадзе.
Тут сее поле земляроб
і ловіць рыбу рыбалоў.
Усе добра, але не вельмі,
бо страляе паляўнічы
у птушку, у птушанятка,
якое плача, бо гіне душа.
І чую я стрэлы,
крык чалавека
і радасць яго...
Чаму?
Я ж знаю, што гэта —
забойства і смерць,
а калі смерць,
дык там і грэх,
вялікі грэх...
Ой, чалавек!
Ты — грэшны!
Ты — грэшны!
Ты — грэшны!
Перад Небам і Зямлёй!
Перад дрэвам і травой!
Перад зверам і вадой!
Ты — грэшны!
А каб замест чорнага каршуна
у тваю душу, у сэрца —
белага жарабя...
Шкадуй усё:
Неба і Зямлю,
дрэва і траву,
звера і ваду.
Тым больш Чалавска —

ты ж сам чалавек,
ты ж брат яго родны.
Чалавек, шкадуй...

**БЕЛАРУСКАМУ МАСТАКУ АЛЯКСЕЮ МАРАЧКІНУ**

Божае вока — гэта свет прыроды,
У ім адлюстроўваюцца
ўсе згоды і нязгоды
Божае вока!
У ім паляўнічы
страляе звяроў
У беднае птушанятка
без мамы
Страляе паляўнічы
стралой!
У аленя з каронай
страляе стралой,
Вастрэй за нож!
Божае вока!
Ратуй нас ад злосці,
Божае вока!
Паглядзі ў сябе!
Ты можаш нас выратаваць!
Дзеці!
Гэта наша шчасце
і згода!
Анёлы!
Ператварыцеся
ў Бога
У сваей Дабрыні, Цеплыні!
Божае вока!
Гэта ратунак жывеле!
А чалавек добры і харошы,
Задумлівы і прыгожы!
Божае вока!
Гэта вока ратунку!
Выратуй нас ад злосці
і ад нягод.
Месячык ясны
Свядзіць кожную ноч.
І зорачкі загарэліся ў небе.
Гэта ўключыў ліхтары
Сам Бог.

* * *

Шчаслівыя людзі на нашай планеце
Дзеці, дзеці, дзеці.
Сумныя людзі на нашай планеце —
Дзеці, дзеці, дзеді.
Вясёлыя людзі на нашай планеце —
Дзеці, дзеці, дзеці.
Дарослыя людзі на нашай планеце
Таксама дзеці.

* * *

Елка пад вакном,
                    зацярушаная снегам.
Белая, як белая кашуля.
Зайчык пад елкаю скача
І плача, і плача, і плача...
Капае слязінка,
таму што халодна:
Ён без ласкі,
                    ён без пяшчоты.
У камяк белы скруціўся
І лета чакае.
А сняжынкі-круцялі
Бегаюць ды бегаюць,
На зайчыка белага
Скачуць ды скачуць.
Замяла віхурачка,
Белая снягурачка.
Скок-паскок — і на неба,
Проста на зайца...

**ТАМ, У ВЫШЫНІ**

Там, у вышыні,
    нябёс блакітных мары.
Там, у вышыні,
    душа вялікага Купалы.
Там, у вышыні,
    усе ад шчасця свеціць,
Там, у вышыні,
    бягуць па сцежцы дзеці.
Там, у вышыні,
    няма грахоў і здрады.
Там, у вышыні...

## ДЗІЦЯЧАЯ СЛЯЗА

Жабрак ідзе па дарозе.
Світанне.
Тамсама ідзе дзіцяня.
Жабрак да яго падыходзіць:
— Чаго ты, маленькі, плачаш?
— Я вельмі стаміўся ад працы,
Багач мяне выкінуў з хаты...
Я плачу...
І ён уцек.
Яго даганяў багач
Страшэнна злосны.
І ён сказаў жабраку:
— Сыдзі з дарогі,
стары!
І жабрак моцна заплакаў,
І слёзы пабеглі з вачэй...

І плакала дзіцяня,
І яшчэ адзін чалавек.

— Навошта ты плачаш,
Чужы чалавек?
— Бо бачу дзіцячыя слёзы,
І лепш я іх выплачу сам.
А потым сказаў жабрак:
— І я ўжо таксама плакаў
З-за гэтага дзіцяняці,
Бо было яму
Вельмі балюча,
Багач даганяў яго злосны,
Агідна абразіў мяне.
Каб жа ў мяне быў конь,
Такі вось, напрыклад:
З-за пазухі ен дастаў
Драўляную цацку —
каня
І з ланцугом на шыі.
Чужынец сціх
І ў жабрака спытаў:

— Навошта ж яму ланцуг?
Жабрак адказаў ледзь чутна:
— Таму што гэтак мы ўсе
Носім ланцуг на шыі,
Бо нашы дзеці
Плачуць...
І ён расхінуў кашулю:
— Бачыш,
      такі ж у мяне...
Сказаў чужынец:
— Сядзі і чакай мяне тут.
Праз нейкі час ён прывёў каня
І разам з ім — жарабя.

— Паслухай,— сказаў жабраку,
Надзень яму з крыжам ланцуг!
Жабрак са здзіўленнем спытаў:
— Навошта яму крыж?
Чужынец так адказаў:
— Каб яго ніхто не забіў.
І каб перашкодзіў ланцуг
Цячы на капыткі слязам,
Бо гэта ж таксама дзіцяня...

Прайшло колькі гадоў,
І вырасла жарабя,
І стала
Прыгожым канём...
Ішоў той самы жабрак
І хлопчыка ўбачыў ён.
Паклікаў яго жабрак:
— Гэй,
      падыдзі да мяне,
Ці помніш мяне ты?
І тут азірнуўся хлопчык,
Але не спыніўся ён —
Пабег да свайго каня.
Пайшоў за ім і жабрак,
І ён накінуў каню
Цяжкі
З крыжам ланцуг.

Тады павітаўся з ім хлопчык
І горка-горка заплакаў.
А потым
Прыйшоў чужынец,
Што шмат гадоў таму
Аддаў жабраку каня.
Спытаў у яго жабрак:
— Адкуль,
    чалавеча, ты тут?
І той адказаў яму:
— Я гэтага злыдня бацька.
Ён даў хлапцу аплявуху.
І горка заплакаў малы...
— Навошта дзіця свае крыўдзіш
Спытаўся жабрак у яго.
Але закрычаў хлопчык:
— Ён мне зусім не бацька,
Мой бацька памёр даўно!..
Тады прамовіў жабрак:
— Аддай ты хлапчыну мне.
А той яму ў адказ:
— А чым ты заплаціш мне?
— Вазьмі мой стары чугай
Ці, можа, лялькі мае...
— Навошта мне лялькі твае?
Я б, можа, б іх і ўзяў,
Каб бачыў,
Што даражыш
Гэтымі цацкамі ты.

І адказаў жабрак:
— Яны дарагія мне,
Бо з імі тут
Для дзяцей
Ладжу спектаклі я...
І хлопчык тады сказаў:
— Даруй мне, Пане мой,
А я пайду з жабраком.
І з тым жабраком ён пайшоў.
А пан той тады сказаў:
— Навошта ж, адкрыйце мне,

На свеце дзіцячыя слезы?..
Ну што ж, ідзіце сабе,
Калі вы хочаце так.
Ну а калі вярнуцца
Будзе ў вас жаданне,
Заўсёды я рады вам.
І злосць сваю праганю.

І дзеці ўсёй зямлі
Разам сказалі тады:
— Мілыя нашы бацькі,
Беражыце малых дзяцей
І, ведама, жарабят.
І вось яшчэ скажам што.
Запомніце,
Што ў дзяцей
Гарчэйшыя ў свеце слёзы,
Калі б'яце вы іх...
Вы пастарайцеся болей
Ніколі іх не чапаць.
Калі ж і пасля гэтага верша,
Самотнага і журботнага,
Вы будзеце зноў бяссэнсава
Гвалт учыняць над дзецьмі,
То з вамі такое ж здарыцца...
Бо, верце, зусім нездарма
«Дзіцячая сляза» —
Так мой верш называецца.

**ВЯСЁЛКА ЖЫЦЦЯ**

Белы — светлы,
Белы — добры,
Белы колер,
Ты — святло.

Блакітны — прыгожы,
Любіў бы цябе,
Ды смутку ты повен
І мары.

Гады маладыя
Дзяцінства свайго
Хачу утрымаць я.
Колас жытнёвага хлеба,
Жоўты, дапамажы!

Аранжавы — цёплы
Агеньчык жыцця.
Ён сэрца мне грэе,
Душу саграває,
Дарогу асвеціць ўначы.

Сіні — прыгожы,
Ды не для мяне.
Ты — колер слёз
І плачу нашчадак.

Ружовы — яркай марай
Ты свеціш для мяне.

Зялёны-зялёны,
Зялёна-балотны,
Ты колер расчараваных
У жыцці.

Карычневы —
Ты вееш працай,
Ты дорыш хлебам,
Ты прадавіты колер

У жыцці.

Чорны —
Колер зямлі,
Колер ценю
І колер чар.

**МУЖЧЫНАМ**

Мужчыны,
гэта вам гавару я, дзіця:
жанчына не можа абараніць сябе.
Хай ваша душа і сэрца
падкажуць вам,
як трэба любіць
жанчыну і дзіцятка,
і асабліва — сваё дзіцятка,
і асабліва — родную жанчыну.

Не трэба караць маленькага,
калі ён правініўся ў чым-небудзь.
Не крычыце на яго:
«Што натварыў ты?!»
Растлумачце яму,
што і як зрабіць трэба.

Бацька — вы,
бацька, вы не крычыце на маму.
Вам пасля будзе сорам,
што вы крычалі
на роднага чалавека.
Я малю, я прашу вас,
не трэба ніколі крычаць
на жанчыну,
на маці,
таму што маміны слёзы
надта горкія,
калі яна плача.
Калі вы, мужчыны,
прачытаеце мае словы,
перадайце іх іншым
і самі
не крыўдзіце аніколі
дзяўчыну,
жанчыну,
жонку,
матулю,
дачку.

* * *

Я ведаю Сусвет,
Квадратны гэты лабірынт —
Налева плйткай б'юць,
Направа — смерць.
Назад мне нельга павярнуць,—
Нікуды — уперад — у нябыт.

* * *

*Бабулі Валі прысвячаю*

Божа!
Зрабі нас вольнымі,
як птушак,
каб адчуць
вецер цёплы
і мора халоднае,
каб зразумець,
як жыцце
над краем прадоння вісіць.
Божа!
Зрабі нас шчаслівымі,
як малых дзяцей,
каб не ведалі жаху,
мучэнняў
і злосці.
Божа!
Зрабі нас бязгрэшнымі,
як ты сам.

## ***Верасень***

* * *

Да зор
У марах
Незбывальных
Імкнуся я
І ведаю:
Яны
У розуме
Маім
Ляцяць
Вышэй ад
Зарніц
І камснем
Праб'юць
Свядомасць
Сёння.

*14 верасня 1996*

* * *

Дождж ідзе,
Бы хтосьці плача,—
Не шкадуе слёз,
Каб звязаць
Канцы з канцамі —
Завяршыць жыццё.
А ў душы
Усё ж надзея
Свечкаю гарыць,
І палае
Бляклым промнем
Залатая ніць.

*15 верасня 1996*

## РАСКОЛІНА

Гэтая бясконцая расколіна
Паміж сапраўдным і неіснуючым
Зацягвае
У нябыт
Тваё Я,
Тваю душу,
Твае цяперашняе жыццё
І твае мары.
І тое незбывальнае,
Што ёсць у табе.

*28 верасня 1996*

## НА МОГІЛКАХ

Поўня.
Навакол цішыня
І нікога няма
Акрамя
Той душы,
Што лятае
У цемры цішы...
І аблудны навец
Душу тую
Шукае,
Што калісьці
Згубіў
І забіў.

*28 верасня 1990*

* * *

Белы шлях...
Ды чорныя меціны
Пакідаем
На гэтым свеце мы.
Дык чаму ж
Не прайсці нам чыстымі?
Дык чаму ж
Не прайсці бязгрэшнымі?
Бо не можа
Душа чалавечая
Сцерагчыся
Спакусы д'яблавай.
І насупраць
Людскога розуму
Паўстае
Грэх вялікі,
Чорны грэх.

*28 верасня 1996*

## СПАЧУВАННЕ

Што спачуваць сіраціне,—
Можа, ў яе лес даўжэй.
Што спачуваць той краіне,
Поўнай бязмоўных людзей.

Што спачуваць той жабрачцы,
Што на цвінтары стаіць,—
Ей бы хоць нейкай падачкі,
Бо ўжо грахоў не змаліць.

Што спачуваць той магіле,
Што ў бяздушшы стаіць.
Паспачувай лепей смерці,
Што за табою ляціць.

*30 верасня 1990*

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

Змест

ВАЛЕРЫЯ КУСТАВА

КРОЎ СУСВЕТУ
Чыстая душа, або Феномен Валерыі Куставай. Васіль Жуковіч (7)
ПАСЛУХАЙ, ЧАЛАВЕЧА...
«Калі вы, мужчыны...»
«Белае поле...»
«Вясна...»
«Беларусь мая...»
«Жыта, жыта, жытачка...»
Мара кахання
«Вясной-вясœнькай...»
Кроў Сусвету
Сад Сусвету — салодкая і вельмі горкая спакуса
Пробліск
ПАРАЛЕЛІ
«Малюнкі...»
Лінія жыцця
Зімою
Паралелі
«Самыя цудоўныя словы на свеце...»
«Цемра чорная...»
ЗЯРНЯТКА
Данчыку
Зярнягка
«Неба...»
«Мае гады расчараванняў...»
«На свеце ёсць багацце...»
ЗОРАЧКА
Чарнобыль
«Стаіць бярозка белая...»
«Мой стары Менск...»
Зорачка
Гледзячы на гравюру Міколы Купавы «Менск»
«Гляджу я на неба...»
«Жыцце наша...»
«Хто ен...»
Вясна
«Ноч ідзе...»
Мроя

Ажыўленне
«Мы ўсе...»
Жах
Потым
«Мой стары сябра...»
Дзяды
«Ідзе старажытны мой гадзіннік...»
Патаемнае
Старая сасна
Хачу я на нолю
ТАМ, У ВЫШЫНІ (Вершы розных гадоў)
«Так хочацца...»
Зямля
Беларускаму мастаку Аляксею Марачкіну
«Шчаслівыя людзі на нашай планеце...»
«Елка пад вакном...»
Там, у вышыні
Дзіцячая сляза
Вяселка жыцця
Мужчынам
«Я ведаю Сусвет...»
«Божа...»
ВЕРАСЕНЬ
«Да зор...»
«Дождж ідзе...»
Расколіна
На могілках
«Белы шлях...» (82)
Спачуванне

Кустава В.

Кроў Сусвету: Вершы/ В. Кустава.; Прадм. В. Жуковіча,— Мн.: Маст, літ., 1996.— 175 с.: іл.

ISBN 985-02-0389-7.

У кнізе прадстаўлены вершы мінчанкі Валерыі Куставай, якой усяго толькі 12 год. Рэдкая з'ява — дзеці пішуць па-даросламу! Спадзяёмся, што кожны, хто разгорне гатае выданне, яшчэ раз пераканаецца, што краіна Беларусь багатая перш за ўсё паэтычным духам і вершаваным хараством. Паэзія Валерыі — яскравы прыклад нязгаснасці над нашай зямлёй зорак шчырасці і даверу.